Шыкіна Т.М., студ. гр. 535Т ФІДК
БГУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Доўнар Л.І.,
канд. пед. навук, дацэнт

# ІНВЕНТАРНЫЯ ВОПІСЫ ЯК КРЫНІЦЫ ІНФАРМАЦЫІ ПА ГІСТОРЫІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ МІНСКАЙ ДУХОЎНАЙ СЕМІНАРЫІ)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне гісторыі бібліятэк і бібліятэчнай справы як састаўной часткі культуры неабходна для разумення агульных заканамернасцей развіцця культуры і спецыфічных праблем бібліятэчнага працэсу.

У даследаванні гісторыі той ці іншай бібліятэкі галоўнымі крыніцамі з’яўляюцца заўсёды першакрыніцы, якімі ў нашым выпадку выступаюць інвентарныя вопісы – адны з найранейшых форм ўліку і бібліяграфавання бібліятэчных фондаў, не атрымаўшыя належнай даследчыцкай увагі беларускіх вучоных.

Інвентарныя вопісы ўзніклі ў сярэднявеччы, калі бібліятэчныя каталогі набылі від менавіта інвентарных вопісаў (часцей за усё ў выглядзе кніг, прыкаваных ланцугамі да стэлажоў і паліц). Запісы вяліся ці па меры набыцця кніг, ці па аўтарскай прыкмеце, або на асобных старонках, якія адпавядалі бібліятэчным паліцам. Інвентарныя вопісы і каталогі выступаюць ужо не як частка апарата кнігі, а як самастойны від бібліяграфічнага жанру.

Аналіз апублікаваных работ па гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі паказвае крайне нераўнамерную іх колькасць па розных храналагічных перыядах, а таксама па асобных рэгіёнах і тыпах. Да нашага часу адсутнічаюць навуковыя даследаванні, якія грунтоўна асвятлялі б гісторыю бібліятэк Беларусі, ды, наогул, застаецца праблема распрацоўкі фундаментальнай гісторыі кнігі і бібліятэк Беларусі. У 1984-1986 гг. былі апублікаваны некаторыя працы М.І. Пакала, сярод якіх і вучэбны дапаможнік “История библиотечного дела в БССР” [7]. Сёння гэта адзінае выданне, у якім выкладзена гісторыя

бібліятэк у Беларусі з даўніх часоў (па адпаведных ідэалагічных прычынах – вельмі схематычна) да пачатку 1980-х гг. Зразумела, што дадзены матэрыял патрабуе ўжо значнага дапаўнення і пашырэння, падачы ў кантэксце развіцця сусветнай гісторыі бібліятэк.

Неабходна адзначыць, што гісторыя бібліятэк розных тыпаў усё ж была тэмай даследаванняў такіх беларускіх вучоных, як В.А. Цыбуля, І.П. Емец, Ю.М. Лаўрык і інш.

Аднак, як можна заўважыць, шэрагу беларускіх даследаванняў бракуе выкарыстання і глыбокага вывучэння першакрыніц, якімі выступаюць інвентарныя вопісы (не кажучы аб тэарэтыка-метадычных пытаннях). Іншая сітуацыя ў даследчыкаў Літвы, Польшчы і Расіі, якія даволі актыўна ўводзяць у навуковы ўжытак названыя першакрыніцы – гэта, напрыклад, паказальнікі інвентарных вопісаў і каталогаў польскай даследчыцы У. Пашкевіч ("Zbióry Polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea, i inne zbióry pamiątek przeszłosci w ojczyznie i na obczyznie", Варшава, 1996); тэарэтыка-метадычныя артыкулы К. Міганя ("Dawne katalogi biblioteczne jako źrodło wiedzy o kulturze książki"), а таксама больш раннія працы К. Гламбёўскага, Ф. Радзішэўскага, Я. Хвалевіка. Паводле даследавання некаторых інвентарных вопісаў выкананы працы па гісторыі бібліятэк у М.В. Нікалаева, Л.І. Уладзімірава, А. Пацявічуса.

Звесткі па гісторыі Фундаментальнай бібліятэкі Мінскай духоўнай семінарыі (ФБМДС), у асноўным, змяшчаюцца ў апублікаваных працах па гісторыі самой семінарыі, грунтоўнейшымі з якіх з'яўляюцца публікацыі М.І. Вержбаловіча [1], названага летапісцам семінарыі. Таксама пэўную колькасць работ па гісторыі і сучасным жыцці семінарыі рыхтуюць і выпускаюць непасрэдна самі святары, напрыклад, епіскап Стэфан (Корзун), свяшчэннік Георгій Сакалоў. Аднак пры дасканальным вывучэнні гісторыі ФБМДС трэба разгледзець і неапублікаваныя дакументы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучаныя і прааналізаваныя вопісы ФБМДС, якія захаваліся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, а гэта: “Вопіс кніг бібліятэкі семінарыі, 1827” [4], “Вопіс кніг бібліятэкі семінарыі, 1845” [5], “Вопіс кніг бібліятэкі семінарыі, без дат” [6], паказваюць, што ў сярэдзіне XIX ст. фонд бібліятэкі налічваў 3600 экземпляраў кніг (друкаваных і рукапісных) і перыядычных выданняў. Асноўную тэматычную групу складалі кнігі па багаслоўю (1146 экз.), славеснасці і мовазнаўстве (490 экз.), гістарычных навуках (363 экз.) і філасофіі (220 экз.). Інвентарныя вопісы таксама сведчаць і аб расстаноўцы кніг, якая прымянялася ў бібліятэцы. Першай прыкметай паводле якой ажыццяўлялася расстаноўка была моўная, што пацвярджае і структура складзеных вопісаў: “Библиотека древних языков, Библиотека Российская, Библиотека Французская, Библиотека Немецкая, Библиотека Польская, Библиотека малоизвестных языков”. Унутры ж кожнай такім чынам арганізаванай “Бібліятэкі” строга вылучаліся сістэматычныя “Разрады”, як “Разряд 1. Богословие, Разряд 2. Философия, Разряд 3. Словесность, Разряд 4. Математика, Разряд 5. Исторические науки. Разряд 6. Языкознание”, у якіх у сваю чаргу літаратура падраздзялялася яшчэ на “Аддзяленні”, прадстаўляючыя іх жанравую і тэматычную разнастайнасць. Напрыклад, “Разряд 1. Богословие” (л. 1-40 об.) мае наступную структуру: “Отделение 1. Библия (л. 1-2); Отделение 2. Симфонии (л. 2); Отделение 3. Отцы Восточные и Западные (л. 2об.-4); Отделение 4. Толкователи Священного Писания (л. 4-13об.); Отделение 5. Системы наук богословских (л. 14-18об.); Отделение 6. Проповедники (л. 18об.-22); Отделение 7. Каноническое право и обряды (л. 22-23); Отделение 8. Смесь (л. 23-40об.)” [4].

Абавязковым было вызначэнне фармату кніг – “у ліст”, “у чвэрць”, “у 8-ю долю”, “у 12-ю долю”, што дае права на меркаванне і аб уліку пры расстаноўцы названых фарматаў. Абследаванне фонду наконт захаванасці яго ў належным фізічным стане, відаць, таксама праводзілася сістэматычна, што адлюстравана ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведных запісах вопісаў, дзе амаль заўсёды адзначаўся стан пераплёту, захаванасць кніг.

Паводле моўнай прыкметы асноўную частку фонду складалі кнігі на старажытных мовах (900 экз.) – як царкоўнаславянскай, так і латыні, а таксама кнігі на рускай мове – не менш 738 экз. Амаль у роўных прапорцыях прадстаўлена нямецкамоўная (189) і польскамоўная (183) кніга, найменшую групу складаюць французскамоўныя выданні (67).

Даволі шырока ў фондзе бібліятэкі была прадстаўлена еўрапейская кніга, асабліва выданні XVI – XVIII стст., якія былі надрукаваны ў такіх выдавецкіх цэнтрах, як Базэль, Антверпен, Амстэрдам, Жэнева, Парыж, Венецыя, Майнц, Франкфурт, Лейпцыг, Вена, Лондан, Рым, Кракаў і інш. Як рэдкія сустракаюцца ў вопісе кнігі з Вільні, Супрасля (XVIII ст.), Нясвіжа (XVII–XVIII стст.), Брэста (XVI ст.), Астрога (XVI ст.).

Складальнікамі вопісаў ФБМДС з’яўляліся бібліятэкары, якія сумяшчалі гэту пасаду з святарскім санам і выкладчыцкай дзейнасцю. Напрыклад, Іаан Яхневіч, святар Слуцкай Васкрасенскай Царквы і настаўнік моў [4].

Такім чынам, інвентарныя вопісы ФБМДС у спалучэнні з іншымі крыніцамі даюць магчымасць скласці больш дакладнае ўяўленне аб тэматычным складзе фонду бібліятэкі, выявіць не толькі колькасныя паказчыкі, але і ў перспектыве паказаць шляхі камплектавання фондаў, кніжныя ўзаемасувязі, узровень развіцця кніжнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Вержболович, М.И. История Минской духовной семинарии: дореформенный период / М.И. Вержболович. – Мінск: Типография Б.И. Соломонова, 1893. – Вып. 1. – 253 с.

2. Доўнар, Л.І. Мінскія кнігазборы XIX стагоддзя / Л.І.Доўнар // Здабыткі : дакум. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Л.Г. Кірухіна, Т.І. Рошчына. – Мінск, 1998. – Вып. 3. – С. 60-72.

3. Лявончыкаў, В.Е. Беларуская бібліяграфія : агульны курс / В.Е. Лявончыкаў. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 262 с.

4. НГАБ. Ф. 797, оп. 2, д. 1.

5. НГАБ. Ф. 797, оп. 2, д. 2.

6. НГАБ. Ф. 797, оп. 2, д. 3.

Покало, М.И. История библиотечного дела в БССР / М.И. Покало. – Мінск : Выш. шк., 1986. – 200 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ